**Краўчанка М. Б.,**
настаўнік рускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
Дуброўскай СШ Светлагорскага раёна

# «Я нарадзіўся на гэтай казачнай зямлі»
## Літаратурная гасцёўня «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся»

**Мэты:**
- фарміраваць у вучняў паважлівыя адносіны да сваёй Айчыны;
- прывіваць любоў да роднай беларускай мовы.

**Матэрыял да урока:**
1. Карта Беларусі.
2. Вершы пра Беларусь.
3. Выстаўка кніг пра Беларусь.
4. На дошцы запісы:

*Я – беларус, я нарадзіўся*
*На гэтай казачнай зямлі,*
*Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх*
*Адвеку прашчуры жылі.*
(Ніл Гілевіч)

*Я тым заўсёды ганаруся,*
*Што ў шчаслівую пару*
*Я нарадзіўся ў Беларусі*
*І так, як маці, гавару.*
(Сяргей Грахоўскі)

*Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе,*
*Хто забыў сваю мову – усё згубіў.*
(Уладзімір Караткевіч)

Гучыць песня «Жураўлі на Палессе ляцяць».

– Белая Русь...Гэтая назва гучыць для мяне ціхім шолахам лісця ў лесе, вясёлай гаворкай нашай невялічкай рачулкі Іпы, чыстай расой на прыгожых кветках, якія заўсёды радуюць вока, развітальным курлыканнем журавоў у восеньскім небе, вясёлым гоманам дзяцей у нашай невялічкай вясковай школе. Гэта ўсё яна, наша Белая, Белая Русь.

*Радзілася я ў Беларусі,*
*Дзе ціхі, задумлівы бор.*
*Ляцяць сюды з выраю гусі*
*Да сініх, цудоўных азёр.*
*Стаяць векавыя дубровы,*
*Даносіцца ласкавы шум.*
*І сонца, і ветрык вясновы*
*Цяплом саграваюць душу...*
*Радзілася я ў Беларусі,*
*Дзе срэбрам крыніцы звіняць,*
*Сюды з крыкам радасным*
*гусі*
*З далёкага поўдня ляцяць.*
(Авяр’ян Дзеружынскі)

Вы, напэўна, ведаеце, што наша краіна на карце падобна на кляновы лісток.

*На карце вялікага свету*
*Яна - як зялёны лісток.*
*Сасмяглая песня лета,*
*Жывое вады глыток!*
*Адвечная калыханка,*
*Душы запаветны куток,*
*Трапеча гарачым ранкам*
*На дрэве нястомны лісток,*
*А ў навальніцу б’ецца,*
*Нябачны паміж лісця,*
*Як роднае матчына сэрца,*
*Што мне даражэй жыцця.*
(В.Вітка)


© «Народная асвета», 2008, №1: www.n-asveta.com\madelny_urok\krauchanka.pdf

– Як лісточак на дрэве кожную вясну з’яўляецца зноў і зноў, нягледзячы на маразы і завеі, так і рэспубліка наша, нягледзячы на перажытыя войны, Чарнобыль, адражаецца зноў і зноў.

– Уважліва паглядзіце на карту Беларусі. Што нагадваюць вам абрысы зямлі нашай?

– А вось М. Гамолка, беларускі пісьменнік, бачыць наш край такім: «Беларусь! Зямля нашых дзядоў і прадзедаў! Мы ганарымся табою, мы любім цябе бясконца. Хораша разляглася ты, наша зямля, на ўлонні старажытнай маці-планеты. І абрысы твае на дзіва сімвалічныя і высакародныя: яны нагадваюць на картах мужную добрую чалавечую далонь. Бяры ж у гэтую працавітую далонь свае багацці і здабыткі, вышэй іх падымай над светам, хай ведаюць людзі ўсіх кантынентаў: жыве Беларусь!» Назавіце найбольш характэрныя рысы нацыянальнага характару беларусаў. (Працавітасць, вынослівасць, шчодрасць, гасціннасць.)

– Беларускі пісьменнік У. Караткевіч лічыць, што абрысы Беларусі на карце нагадваюць нашага магутнага цара Белавежскай пушчы – зубра.

– Прачытайце верш Ніла Гілевіча «Я – беларус».

*Я – беларус, я нарадзіўся*
*На гэтай казачнай зямлі,*
*Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх*
*Адвеку прашчуры жылі.*

*Я – беларус, я ганаруся,*
*Што маю гэтае імя:*
*Аб добрай славе Беларусі*
*Ў свеце знаюць нездарма.*

*Я – беларус, і я шчаслівы,*
*Што маці мову мне дала,*
*Што родных песень пералівы*
*І зблізку чую, і здаля...*

– Чым ганарыцца лірычны герой ў гэтым вершы?

– Скажыце, калі ласка, а калі вы адчулі гонар за тое, што вы беларусы?

(Сёння кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь можа ганарыцца дасягненнямі сваёй краіны ў эканоміцы: Беларусь лідзіруе ў СНД па вытворчасці тэлевізараў, халадзільнікаў, тканіны і абутку, займае першае месца па вытворчасці на душу насельніцтва цукру-пяску; мае высокія дасягненні ў спорце, навуцы, мастацтве. Можна кожнаму беларусу ганарыцца поспехамі спатсменаў на 19 чэмпіянаце Еўропы па лёгкай атлетыцы, трыумфам юных артыстаў на Еўрабачанні і інш. Важная з’ява ў жыцці краіны – адкрыццё Нацыянальнай бібліятэкі.)


© «Народная асвета», 2008, №1: www.n-asveta.com\madelny_urok\krauchanka.pdf

– Чым яшчэ ганарыцца лірычны герой? Так, сваёй мовай. Паслухайце верш Уладзіміра Мазго.

*Ты адкуль бруішся, мова?*
*З сініх нёманскіх крыніц?*
*Па зямлі збіраю словы,*
*Нібы россыпы суніц.*
*Мілая, адзіная,*
*Нам, нашчадкам, дадзена*
*Любаю радзімаю*
*Ад дзядоў і прадзедаў.*

– Звярніце ўвагу на словы Сяргея Грахоўскага на дошцы.

*Я тым заўсёды ганаруся,*
*Што ў шчаслівую пару*
*Я нарадзіўся ў Беларусі*
*І так, як маці, гавару.*

– Беларуская мова вельмі мілагучная, спеўная, прыгожая. Нездарма многія беларускія паэты прысвяцілі ёй свае вершы.

(Вучні чытаюць вершы пра родную мову.)

*Родная мова, цудоўная мова!*
*Ты нашых думак уток і аснова!*
*Матчын дарунак ад самай калыскі,*
*Ты самацветаў яскравая нізка.*

*Кожная з іх барвы дзівосныя мае,*
*Вечным агнём зіхаціць – не згарае.*
*Ты мне заўсёды была дапамогай,*
*Дзе б і якой не хадзіў я дарогай.*

*Чую ў табе пераразвоны крыніцы,*
*Чую ў табе і раскат навальніцы,*
*Чую павевы зялёнага бору,*
*Водгулле працы ў родным прасторы.*

*Кожнай драбнічкай ты варта пашаны,*
*Кожнае слова вякамі стварана,*
*І на вякі яно жыць застанецца,*
*Вечнае так, як народнае сэрца.*

(Уладзімір Дубоўка)

*З легендаў і казак былых пакаленняў,*
*З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,*
*З сузор'яў і сонечных цёплых праменняў,*
*З дрымучага ззяння бурлівых крыніц,*


© «Народная асвета», 2008, №1: www.n-asveta.com\madelny_urok\krauchanka.pdf

*З птушынага шчэбету, шуму дубровы,*
*І з гора, і з радасці, і з усяго*
*Таго, што лягло назаўсёды ў аснову,*
*Святыні народа, бяссмерця яго, –*
*Ты выткана, дзіўная родная мова.*

(Максім Танк)

*Мова,*
*Пявучая родная мова,*
*Ты – уладарка нявызнаных скарбаў.*
*Столькі значэнняў, гучанняў і фарбаў*

*Мае ў сабе твае кожнае слова.*
*Іншае слова напоўнена плёскам*
*Хвалі дняпроўскай.*
*Іншае слова такое,*
*Што рэха лясное*
*Ў яго глыбінях затоена.*

*Ёсць і як мёд залатое, густое,*
*На травах яно духмяных настоена.*
*Ціха гучаць у мове маёй*
*Словы пяшчотныя,*
*Словы крынічныя,*
*Росныя.*

*Чуюцца ў ёй –*
*І грымотныя,*
*Зычныя,*
*Водгулле бітваў у іх*
*Разлягаецца грознае.*

*Часам бывае – заззяе неспадзявана*
*Новаю зоркаю слова-абнова.*
*Колькі ў табе нявызначаных скарбаў схавана,*
*Мова мая,*
*Пявучая родная мова.*

(Алесь Зарыцкі)

*Над намі словы ўладараць.*
*Мы чуем і гаворым іх,*
*Яны то здружаць, то пасвараць*
*Сяброў і ворагаў маіх.*

*Бо словы розныя бываюць:*
*Адны – агню стрымаюць шквал,*


© «Народная асвета», 2008, №1: www.n-asveta.com\madelny_urok\krauchanka.pdf

*Другія словы забіваюць*
*Ўсё жывое напавал.*

*Ад слова сэрца халадзее*
*Праходзіць сон і забыццё.*
*Ад слова рушацца надзеі,*
*Ад слова свеціцца жыццё.*

*Ад слова вырастаюць крылы,*
*А ў сэрца стукае любоў,*
*Ад слова прыбываюць сілы,*
*Дык не шкадуйце шчырых слоў!*
(Сяргей Грахоўскі)

*Слова – радасць, слова – чары,*
*Вобраз вечна юных вёсен,*
*Ёсць ты ўсюды: у сонцы, у хмары,*
*Ты глядзіш праз неба просінь.*

*Лашчыш слух мой, слова-ззянне,*
*Атуляеш сэрца ласкай,*
*Ноч і вечар, дзень, світанне*
*Абняло ты, слова-краска.*
(Якуб Колас)

– Дзе б вы ні былі, шануйце сваю родную мову.

*Гавары роднай мовай сваёй,*
*Прыгажэй за пялёсткаў вішнёвых,*
*Што крыштальнай сваёй чысцінёй*
*Выпраменьвае з ласкаю словы.*
*Гавары роднай мовай сваёй,*
*Што гадамі ніштo не скрышыла.*
*Таму наканавана ёй на вякі –*
*Неўміручасць і сіла.*
(Авяр’ян Дзеружынскі)

– Мне вельмі прыемна, што былыя вучні нашай школы любяць, шануюць і ганарацца сваёй мовай. І нават, калі яны пражылі за межамі сваёй краіны больш дзесяці гадоў, пішуць лісты на беларускай мове.

(Чытаю ліст былога вучня школы.)

## Інтэлектуальная гульня «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся»

**Мэты:** пашырыць веды пра гісторыка-культурную спадчыну Беларусі і яе


© «Народная асвета», 2008, №1: www.n-asveta.com\madelny_urok\krauchanka.pdf

сучасныя дасягненні; фарміраваць паважлівыя адносіны да сваёй Радзімы, выхоўваць пачуццё гонару і глыбокай павагі да нацыянальных традыцый, звычаяў, культуры.

Да ўрока неабходна размеркаваць вучняў на каманды. Гучыць фанаграма песні пра Радзіму.

**Першы чытальнік**. *О Беларусь, мая калыска,*
*Жыццё маё, прытулак мой!*
*З гарачаю любоўю нізка*
*Схіляюся перад табой.*
*Зямны паклон табе, Радзіма,*
*Тваім палям, тваім лясам,*
*Тваім заводам з белым дымам,*
*Тваім гасцінцам і шляхам.*
*На спелых нівах ураджайных,*
*Ад краю ў край, ва ўсе канцы,*
*Махаюць крыламі камбайны,*
*Спяваюць жнеі і касцы.*

**Другі чытальнік**. *Мяжуе з Польшчай, Украінай,*
*Расіяй, Латвіяй, Літвой.*
*Твой родны край, твая Айчына –*
*Жыццё тваё і гонар твой.*
*І ты яе запомні імя,*
*Як неба, сонца і зару.*
*Твая зямля, твая радзіма*
*Названа светла –*
*Беларусь.*

**Настаўнік**. Прывітанне, паважаныя сябры! «Беларусь – мая маці і мова, паветра і хлеб»,– сказаў паэт. Кожны чалавек непасрэдна звязаны з той зямлёй, на якой нарадзіўся. Так і мы павінны ведаць, што краіна, у якой мы жывём, – гэта самае дарагое, што ў нас ёсць. Патрэбна толькі сэрцам адчуць еднасць з ёй, ведаць мінулае раднага краю, ганарыцца яго культурнай спадчынай.

Для нас надышоў самы хвалюючы і адказны момант – гэта інтэлектуальная гульня. Яе правілы наступныя. Кожная каманда па чарзе выбірае намінацыю з прапанаваных і, адпаведна, пытанне з пазначанай колькасцю балаў (ад 10 да 80). Калі каманда не здолее адказаць на пытанне, балы залічваюцца той камандзе, якая першая агучыць правільны адказ.

| **№п\п** | **Намінацыя** | **Колькасць балаў** | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Дзяржава і яе сімвалы | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 | 60 | 70 | 80 |
| 2. | Культурная спадчына | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 | 60 | 70 | 80 |


© «Народная асвета», 2008, №1: www.n-asveta.com\madelny_urok\krauchanka.pdf

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3. | Песняры | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 | 60 | 70 | 80 |
| 4. | У свеце народных традыцый | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 | 60 | 70 | 80 |
| 5. | Крок у будучае | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 | 60 | 70 | 80 |
| 6. | Зямля пад белымі крыламі | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 | 60 | 70 | 80 |

**Пытанні**

**1. Дзяржава і яе сімвалы**

**10 б.** Кожны год у нашай краіне ладзіцца шмат святочных мерапрыемстваў, прымеркаваных да розных памятных падзей. Летам мы адзначаем надзвычай важнае і любімае народнае свята. На яго заўсёды запрашаюць шмат гасцей з розных краін свету. Гэта свята сімвалізуе еднасць народа і дзяржавы, нашу самабытнасць. Адзначаецца яно ў дзень вызвалення Мінска ад гітлераўскіх захопнікаў. Як называецца гэта свята і калі адзначаецца?

*(Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, або Дзень Рэспублікі – 3 ліпеня.)*

**20 б.** Беларусь – незалежная дзяржава. Але наш народ паважае іншыя народы і ганарыцца братэрскімі сувязямі. У нашай краіне адзначаецца як свята Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі. Калі адзначаецца гэта свята?

*(2 красавіка.)*

**30 б**. Кожная дэталь у гэтым дзяржаўным сімвале мае сваё значэнне. Зялёны колер тэрыторыі Беларусі ў залатых промнях узыходзячага Сонца гаворыць аб тым, што ўсе свае думкі грамадзяне скіроўваюць да Айчыны: гэта наша зямля, нам чужой не трэба. Але і сваёй не аддамо. Контур краіны знаходзіцца ў сярэдзіне сімвала, утворанага вянком з каласоў. Пра які дзяржаўны сімвал ідзе размова? *(Герб.)*

**40 б.** Наш сцяг мае тры колеры: чырвоны, зялёны, белы. Чырвоны колер служыць знакам Сонца, сімвалізуе братэрства. Зялёны колер – Прырода. Гэта палі, лясы краіны. Гэта колер дабра, росту, развіцця, дабрабыту і міру. Што сімвалізуе белы колер і арнамент?

(*Белы колер – колер свабоды, маральнай чысціні і мудрасці. Арнамент сімвалізуе працавітасць, народнае майстэрства.*)

**50 б**. Гімн расказвае пра мінулае беларускага народа, у ім гучыць пажаданне славы, росквіту, вечнага жыцця Беларусі, заклік любіць і шанаваць Радзіму. Хто з’яўляецца аўтарам музыкі і тэксту Дзяржаўнага гімна?

(*Музыка Нестара Сакалоўскага, словы Міхася Клімковіча, Уладзіміра Карызны.*)

**60 б.** Герб і сцяг Рэспублікі Беларусь прыняты ў выніку усенароднага галасавання 14 мая. Якога года? (*1995-га.*)

**70 б.** Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь – асноўны Закон краіны. У нашай краіне было прынята пяць канстытуцый.: у 1919 г., 1927 г., 1937 г., 1978 г. Калі


© «Народная асвета», 2008, №1: www.n-asveta.com\madelny_urok\krauchanka.pdf

была прынята апошняя Канстытуцыя? (*15 сакавіка 1994 года.*)

**80 б.** Назавіце важнейшае права чалавека, якое замацавана ў Канстытуцыі. (*Права на жыццё.*)

## 2. Культурная спадчына

**10 б.** Назавіце нашу святую, якую здаўна шануюць як нябесную заступніцу беларускай зямлі, як асветніцу нашых продкаў. (*Еўфрасіння Полацкая.*)

**20 б.** У першага самастойнага ўладара Полацкага княства Рагвалода была дачка. Якімі трыма імёнамі называюць яе? (Рагнеда – Гарыслава – Анастасія.)

**30 б.** Назавіце імя друкара, год і горад, дзе пачалі друкавацца першыя кнігі на старабеларускай мове. (*Ф. Скарына, 1517 г., Прага.*)

**40 б.** Назавіце імя паэта-гуманіста эпохі Адраджэння, які паходзіў з сям'і паляўнічага. У 1518 г. у складзе польска-літоўскай дыпламатычнай місіі трапіў у Рым, дзе ў 1522 годзе стварыў свой лепшы твор – паэму-жамчужыну, прасякнутую любоўю да роднай зямлі. (*Мікола Гусоўскі.*)

**50 б.** Перанясёмся ў 1629–1680-я гг. На гэты час прыпадае дзейнасць славутага сына полацкай зямлі. Літаратурная спадчына паэта, драматурга, асветніка і філосафа даволі разнастайная: «Буквар языка славенскага...», «Рыфмалагіён», «Вертаград мнагацветны», камедыі, прытчы, казанні, рытуальныя прамовы-пропаведзі. Назавіце імя гэтага славутага дзеяча. (*Сімяон Полацкі.*)

**60 б**. Адзін з самых вядомых прадстаўнікоў свайго роду. Вялікі літоўскі гетман, адзін з прэтэндэнтаў на карону Рэчы Паспалітай. Мастак і цудоўны музыкант. Самы вядомы створаны ім паланез «Развітанне з Радзімай» носіць яго імя. (*Міхаіл Клеафас Агінскі.*)

**70 б.** Назавіце імя славутага мастака пачатку ХХ ст., які нарадзіўся ў Беларусі, жыў і ствараў палотны ў Пецярбургу, аўтара знакамітай карціны «Лютаўскі блакіт» (Февральская глазурь). (*Ігар Грабар.*)

**80 б.** Назавіце прозвішча скульптара, аўтара цудоўнага ансамбля на плошчы Якуба Коласа ў Мінску. (*Заір Азгур.*)

## 3. Песняры

**10 б.** *Мой родны кут, як ты мне мілы!*
*Забыць цябе не маю сілы!*

Назавіце аўтара гэтых бессмяротных радкоў. (*Якуб Колас.*)

**20 б.** З творчасцю славутага песняра Янкі Купалы мы знаемыя з дзяцінства. Нас зачароўвае песня «Спадчына» на словы з аднайменнага твора. А ці памятаеце вы, дзе нарадзіўся пісьменнік? (*У Вязынцы.*)

**30 б.** Сапраўднае імя гэтага пісьменніка – Іван Фёдараў. Прыгодамі яго палескіх рабінзонаў цікавяцца падлеткі. Назавіце псеўданім – творчае імя пісьменніка. (*Янка Маўр.*)

**40 б**. Гэтага пісьменніка называюць гонарам і сумленнем беларускай літаратуры. Дыяпазон яго твораў шырокі і разнастайны: ад казкі «Нямоглы бацька» да рамана «Каласы пад сярпом тваім». У Віцебску яму пастаўлены помнік з надпісам «Быў. Есць. Буду». (*Уладзімір Караткевіч.*)


© «Народная асвета», 2008, №1: www.n-asveta.com\madelny_urok\krauchanka.pdf

**50 б.** Паэт, які амаль усё жыццё правёў за межамі Радзімы, але лічыў сваім абавязкам пісаць творы на мове свайго народа. Лёс адвеў яму кароткі зямны век. Аўтар адзінага прыжыццёвага зборніка «Вянок». У 2007 г. адбыліся 90-я ўгодкі з дня смерці паэта. Назавіце яго імя. (*Максім Багдановіч.*)

**60 б**. Назавіце аўтара раманаў «Бацькаўшчына», «Зямля», «Пошукі будучыні». Дзяцінства яго прайшло ў весцы Цімкавічы на Капыльшчыне. (*Кузьма Чорны.*)

**70 б.** Пісьменнік, які з'яўляецца майстрам псіхалагічнага партрэта. Вайна наклала на яго творчасць глыбокі адбітак. Аповесці «Жураўліны крык», «Трэцяя ракета», «Сотнікаў», апавяданні «Сваякі», «Незагойная рана» ўражваюць глыбокім псіхалагізмам. (*Васіль Быкаў.*)

**80 б.** Назавіце пісьменніка – аўтара раманаў «Людзі на балоце», «Подых навальніцы», «Завеі, снежань». Дзе ён нарадзіўся? Які буйны твор гэтага пісьменніка прысвечаны вызваленню Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў? (*Іван Мележ, веска Глінішчы Хойніцкага раёна. Раман «Мінскі напрамак».*)

## 4. У свеце народных традыцый

**10 б.** Гэта старажытнае свята было прымеркавана да зімовага сонцастаяння. Пазней яго пачатак сталі звязваць з Нараджэннем Хрыстовым. На свята людзі вадзілі казу, мядзведзя, насілі зорку. У святочных песнях гучалі самыя лепшыя зычэнні. За песні і пажаданні гаспадары частавалі юнакоў і дзяўчат рознымі прысмакамі. (*Каляды.*)

**20 б.** Падчас гэтага свята хлопцы і дзяўчаты водзяць карагоды, скачуць праз вогнішча і шукаюць самую чароўную кветку шчасця. (*Купалле.*)

**30 б.** На якое вясёлае свята пачыналі гукаць вясну? (*Масленіца.*)

**40 б.** Як называецца свята, калі ўшаноўваюць памяць памерлых продкаў? (*Дзяды.*)

**50 б.** Як называецца цыкл народных песень, звязаных з земляробчым календаром? (*Каляндарна-абрадавыя.*)

**60 б.** Найвялікшае каляндарнае свята, з пашырэннем хрысціянства прыстасавана да ўваскрашэння Хрыста і стала рухомым. Адзначаецца з 4 красавіка да 8 мая. (*Вялікдзень.*)

**70 б.** Напярэдадні гэтага свята, 5 мая, беларусы ўшаноўвалі сімвал вясны, росквіту прыроды. Дзяўчаты на лузе выбіралі самую прыгожую дзяўчыну. Апраналі яе русалкай. Упрыгожвалі зелянінай, вянком з кветак. Вадзілі вакол яе карагоды і спявалі:

*Блаславі, маці,*
*Ой, Лада, маці,*
*Вясну заклікаці.* (*Юр'я.*)

**80 б.** На якое свята спявалі прыпеўку:

*Ой, чыя то дачка, як ягадачка,*
*Святы вечар добрым людзям!*
*Бацькова дачка, як ягадачка.*

*Як у сені ўвайшла – сені заззялі.*
*Як у хату ўвайшла – паны паўставалі.*
(*Каляды*.)

**5. Крок у будучае**

**10 б.** Гэтым будынкам можа ганарыцца кожны грамадзянін нашай краіны. «Храм навукі» мае агульную плошчу 112,6 тыс. квадратных метраў. На 22 паверсе знаходзіцца закрытая назіральная пляцоўка «Панарама». (*Нацыянальная бібліятэка Беларусі.*)

**20 б.** Будынак на перакрыжаванні шляхоў. Яго прыгажосць, сучаснасць і зручнасць здзіўляюць людзей, якія ўпершыню наведваюць нашу краіну. (*Вакзал.*)

**30 б.** Гэты завод быў заснаваны ў 1946–1948 гг. Яго прадукцыя носіць назву нашай дзяржавы, гэты брэнд вядомы далёка за межамі краіны. (*Мінскі трактарны завод.*)

**40 б.** У 1931 г. была заснавана гэта самая любімая ўсімі дзецьмі фабрыка. Яе салодкая прадукцыя карыстаецца вялікім попытам. А яе якасцю задаволены самыя патрабавальныя пакупнікі. Яе брэнды «Белавежска пушча», «Лявоніха» і інш. (*Камунарка*.)

**50 б.** Імя дзяўчынкі Ксеніі Сітнік стала вядома жыхарам нашай краіны імгненна. Чаму? (*Трыумфальнае выступленне на дзіцячым конкурсе Еўрабачання.*)

**60 б.** Гэта адна з самых маладых спартыўных пабудоў Мінска. Сучасны будынак з металу, шкла, бетону. Мае арэны для міні-футбола, для міжнародных спаборніцтваў. (*Манеж футбольны.*)

**70 б.** Прадукцыя гэтага завода прысутнічае амаль у большай паловы жыхароў краіны. Без яе немагчыма захаваць прысмакі і стравы ў спякотны дзень. (*Мінскі завод халадзільнікаў «Атлант».*)

**80 б.** Назавіце фонд, які падтрымлівае моладзь краіны. У межах якой праграмы ён існуе? (*Прэзідэнцкі фонд па падтрымцы таленавітай моладзі ў межах праграмы «Маладыя таленты Беларусі 2006–2010 гг.»*)

**6. Зямля пад белымі крыламі**

**10 б**. Якая птушка з’яўляецца сімвалам нашай краіны? (*Бусел.*)

**20 б.** У гушчары старых бароў, як сляза, што ўпала з неба, блішчала вялікае возера... Назавіце самае вялікае па плошчы возера, размешчанае ў Мядзельскім раёне. Пра яго складзена шмат народных легендаў і паданняў, а Максім Танк прысвяціў яму сваю паэму. Побач з ім размешчаны беларускі курорт. (*Возера Нарач.*)

**30 б.** Якую расліну – сімвал беларускай зямлі – згадвае М. Багдановіч у славутым вершы «Слуцкія паясы». (*Васілёк.*)

**40 б.** Якое дрэва распусціла галлё над курганам у знакамітай паэме Янкі Купалы «Курган»? (*Дуб.*)

**50 б.** Самая магутная жывёла нашых лясоў, якая захавалася толькі ў знакамітай пушчы. Мікола Гусоўскі прысвяціў паляванню на гэту жывёлу шмат радкоў сваёй паэмы. (*Зубр, Белавежская пушча.*)

**60 б.** Самае старажытнае дрэва ў нашых лясах. Гэта асноўная парода, якая дае


© «Народная асвета», 2008, №1: www.n-asveta.com\madelny_urok\krauchanka.pdf

драўніну для будаўніцтва, вытворчасці высокаякаснай паперы, штучных валокнаў. З яго драўніны вырабляюць музычныя інструменты. (*Елка.*)

**70 б.** На месцы былой сельскагаспадарчай выстаўкі быў закладзены Цэнтральны батанічны сад Акадэміі навук Беларусі. У якім годзе адбылася гэта падзея? (*У 1931 г.*)

**80 б**. У якім скверы горада Мінска ў 2001 г. адбылася рэканструкцыя? Вядомасць яму надалі скульптурныя кампазіцыі «Дзяўчынка пад парасонам», «Дама», «Курыльшчык». Як называецца гэты сквер? (*Міхайлаўскі сквер.*)

**Настаўнік.** Вось і скончана на сёння вандроўка па старонках гісторыі і сучаснасці нашай Радзімы.

Ад кожнага з нас залежыць, якой будзе наша дзяржава. І кожны сам павінен задаць сабе пытанне: што асабіста я магу зрабіць для Радзімы.

**Трэці чытальнік.** *Мая Беларусь –*
*Прыдняпроўе, Палессе,*
*Край сініх азёраў і рэк.*
*Айчына Купалавай песні,*
*Што ў сэрцы запала навек.*

**Чацвёрты чытальнік.** *О Беларусь, мая шыпшына,*
*Зялёны ліст, чырвоны цвет.*
*У ветры дзікім не загінеш,*
*Чарнобылем не зарасцеш.*

**Пяты чытальнік.** *Пакуль сонца не згасне,*
*Пакуль свецяцца зоры,*
*Беларусь не загіне!*
*Беларусь будзе жыць!*

Гучыць песня «Люблю цябе, Белая Русь»


© «Народная асвета», 2008, №1: www.n-asveta.com\madelny_urok\krauchanka.pdf